## Гістарычная даведка

Урачыстае адкрыццё школьнага этнаграфічнага кутка «Беларуская хатка» адбылося 13 верасня 2003 года.

Ініцыятарамі стварэння кутка выступілі настаўнікі беларускай мовы і літаратуры Наумік В.Ф., Неткачава В.А. і Шамяцюк В.А..

Этнаграфічны куток размяшчаўся ў кабінеце №21. У абсталяванні кутка прымалі ўдзел настаўнік працоўнага навучання Солаваў І.М., намеснік дырэктара па АГЧ Зорын М.М. і рабочы па абслугоўванні памяшканняў Верховец В.М..

Экспанаты прадставілі вучні школы, настаўнікі і бацькі вучняў.

Шамяцюк В.А. распрацавала экскурсіі і падрыхтавала першую групу экскурсаводаў.



Неткачава В.А., Шамяцюк В.А., Наумік В.Ф.



Першая група экскурсаводаў Шамяцюк В.А.
2003 год.

## Ружанская кераміка

Ружаны здаўна славіліся сваімі ганчарамі. Не дзіўна, што цэнтральнае месца сярод экспанатаў этнаграфічнага кутка займаюць керамічныя вырабы мясцовых майстроў.

Кераміка прадстаўлена посудам. Тут ёсць глякі, збаны, гладышы, гаршкі, міскі, кубкі.









## Калекцыя вышываных вырабаў

У этнаграфічным кутку ёсць калекцыя вышываных вырабаў. У першую чаргу, гэта ручнікі. Ёсць таксама сурвэткі, абрус і нават шторы.

Адзін з каштоўных экспанатаў – гэта ручнік, вытканы ў 2002-2003 годах вучнем нашай школы Пукерам Паўлам на кроснах у мясцовым ШПЦ пад кіраўніцтвам Прэдка Р.І., якая ў той час была дырэктарам ШПЦ і вяла заняткі гуртка «Ткацтва».



Ручнік Пукера Паўла





Вышываны абрус

Зараз загадвае этнаграфічным кугком «Беларуская хатка» настаўніца беларускай мовы і літаратуры Шапырова Н.М – выпускніца Ружанскай СШ і выхаванка Шамяцюк В.А.



Экскурсію праводзіць Шостак Арцём.



**Прыязджайце!**
**Будзем вельмі рады вітаць вас у нашым этнаграфічным кутку «Беларуская хатка»!**

**Наш адрас:**
**вул. К.Марача, д.5**
**225154 гп Ружаны, Пружанскі раён, Брэсцкая вобласць**

**Тэлефон для сувязі: (801632) 44138**
**e-mail: ruzhany-school@pruzhany.by**

**Вас вітаць заўсёды рады!**







# ДУА «Ружанская сярэдняя школа імя Казіміра Марача» Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці

# Этнаграфічны куток «Беларуская хатка»





**2024 год**